# АЎТАІНСТРУКТАР НА АБЦАСАХ

### Руль у надзейных руках

Вольга ўспамінае таксама начныя паездкі з сяброўкай, якая брала бацькоўскі аўтамабіль, і яны разам каталіся па вёсцы. Вольга аднойчы папрасіла даць паруліць. Сяброўка і навучыла ўсяму. Вольга адразу зразумела, што гэта яе. І калі да гэтага былі думкі падаць дакументы ў мастацкае вучылішча — з адзнакай скончыла мастацкую школу, то пасля таго, як пакарыла жалезнага каня, ні пра што іншае не думала, як толькі пра работу на аўто.

Вучоба прайшла лёгка. Здала ўсё з першага разу. А праз некалькі гадоў прыйшла ў гэтую ж аўташколу працаваць.

— Вакансію знайшла выпадкова. Сядзела дома, гартала газету і трапіла на аб'яву, — расказвае Вольга. — Аўташколе, дзе я вучылася, патрабаваўся майстар вытворчага абучэння. Запісалася да дырэктара на прыём і смела агучыла яму свае планы. Ён спачатку адмахнуўся, маўляў, не жаночая гэта прафесія. Толькі пажартаваў: калі прайду дадатковае навучанне ў Мінску, ён падумае. Але я дзяўчына ўпартая, адразу ж накіравалася ў сталіцу. Калі вярнулася адтуль з запаветнай «коркай», дырэктар здаўся. З тых пор і працую аўтаінструктарам. Стаж ужо 12 гадоў. Такога пастаянства ніхто з маіх паслядоўніц не прадэманстраваў. Пасля мяне ў аўташколу прыходзілі яшчэ жанчыны, але доўга не вытрымлівалі. Да гэтай прафесіі трэба яшчэ прывыкнуць. Я ж імкнулася паказаць, што жанчыны спраўляюцца з ёй не горш за мужчын, а дзесьці, магчыма, і лепш. Як пацвярджэнне, былі і граматы, і падзякі, у тым ліку і ад ДАІ.

### «Падразалі», а потым ... прасілі прабачэння

У якасці аўтаінструктара Вольга паспрабавала сябе ў трох аўташколах. Зараз яна майстар вытворчага абучэння механічнага транспартнага сродку ў магілёў-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



скай аўташколе «Сігнал». І шмат хто спецыяльна да яе запісваецца на ваджэнне. Арыентуюцца на водгукі ў інтэрнэце. Пры першым знаёмстве некаторыя атрымліваюць лёгкае расчараванне. Ну чаму гэта дамачка са знешнасцю кіназоркі можа навучыць? Але пачнеш з ёй размаўляць і разумееш, што перад табой не легкадумная дзяўчына, а асоба з моцным характарам. Без упартасці і цвёрдасці наогул у гэтай прафесіі нічога не атрымаецца. За 20 заняткаў навучыць чалавека, які за рулём ніколі не сядзеў, ваджэнню — не простая задача. Асабліва ў горадзе, дзе вялікі рух і кіроўцы, на жаль, не ўсе дысцыплінаваныя.

Адзін раз у вучэбнае аўто ззаду ўляцела машына. На шчасце, траўмы былі нязначныя. А нядаўна іх аўто жорстка падрэзаў БМВ. Нахабнікаў, на жаль, хапае. Але хутка крыўдзіцель знайшоўся. Праз два дні Вользе пазваніў знаёмы інструктар і паведаміў, што той чалавек, які «падрэзаў» «вучэбку», просіць прабачэння. Ён свядома парушыў правілы, каб самому пазбегнуць аварыі, і запомніў нумары, каб потым выбачыцца. Быў вельмі ўражаны, калі даведаўся, што інструктарам аказалася жанчына.

— А яшчэ быў выпадак на кальцавым перакрыжаванні, калі ліхач «падрэзаў» вучэбнае аўто, ды яшчэ і курсантку зняважыў, — расказвае Вольга. — Сказаў, што яна правілы парушае. Насамрэч, парушыў ён. Проста не ведаў пра апошнія змяненні ў ПДР. Дзяўчына ж вельмі засмуцілася. Але я сваіх у крыўду не даю. Патэлефанавала ў ДАІ, патлумачыла ў чым справа, на наступны дзень гэты чалавек патэлефанаваў і папрасіў прабачэння. Сказаў, што прыйдзе на пераабучэнне. І курсантцы патэлефанаваў, сказаў, што пагарачыўся.

Вольга сярод сваіх курсантаў аўтарытэт. Прызнаецца, што яе вельмі засмучае, калі ў кагосьці не атрымліваецца, стараецца дапамагчы, падбадзёрыць. Перажывае, калі дзяўчаты плачуць з-за няўдач або рэзкасці іншых інструктараў. Безаглядна кідаецца абараняць курсантак. Вельмі хвалюецца, калі яе падапечныя здаюць экзамен ў ДАІ. Калі няма магчымасці падтрымаць чалавека на месцы, тэлефануе і цікавіцца, як справы. Нехта ёй аднойчы расказваў, як разгубіўся падчас экзаменацыйных іспытаў, не ведаў, што рабіць, і раптоўна пачуў за спіной яе голас. У выніку прыйшла ўпэўненасць, і экзамен быў здадзены.

— Пры выездзе нашага вучэбнага аўто ў горад заўсёды малюся: «Дай Бог, каб сёння было ўсё добра!», — кажа Вольга. — Работа аўтаінструктара небяспечная. Адсочваеш усё, што адбываецца на дарозе, ці ідуць там пешаходы, што робіцца ззаду, якія рухі выконвае курсант, ці тую педаль выціснуў, ці тую перадачу ўключыў. Трэба паказаць, патлумачыць. Бывае, вечарам прыходзіш дамоў выціснуты як лімон і думаеш: трэба мяняць прафесію. І так 12 гадоў. А раніцай усё пачынаеш ізноў. Бяжыш на работу і разумееш, што гэта тваё. Яна падабаецца мне за стасункі з рознымі людзьмі. За тыя шчаслівыя эмоцыі, калі курсанты атрымліваюць правы і радуюцца. Адчуваеш, што і ты да гэтага маеш дачыненне.

### «Было не па сабе, і я пела»

Багатым на прыгоды быў перыяд, калі Вольга працавала адначасова на трох работах — днём у аўташколе, вечарам на таксі, у выхадныя на міжгародніх перавозках. Пяць гадоў яна курсіравала на пасажырскай маршрутцы паміж Магілёвам і Бабруйскам. У 2016 годзе ўбачыць жанчыну за рулём аўтобуса было яшчэ дзіўна. Пасажыры вельмі бурна на гэта рэагавалі. Некаторыя адпраўляліся з ёй у дарогу з пачуццём страху, а потым перадавалі цераз дыспетчара падзякі за вельмі камфортную паездку.

Аднойчы ў маршрутцы ехалі на нейкае свята два мужчыны з цюльпанамі. Убачылі, што жанчына за рулём, сталі гэта бурна каментаваць, а калі высаджваліся, тыя кветкі Вользе падарылі. Іншы раз пасажырка папрасіла Вольгу сфатаграфавацца з ёй на памяць, сказала, што ёй не паверыць, калі яна раскажа, што яе везла жанчына. І папрасіла аўтограф.

Здараліся і экстрэмальныя паездкі. Аднойчы пры абгоне фуры, калі машына ўжо вярталася ў сваю паласу, яе стала «штарміць» — лопнула задняе кола. Бабруйская траса вузкая, страшна падумаць, што магло б стаць з маршруткай, поўнай пасажыраў, калі б сітуацыя выйшла з-пад кантролю. Вольга хутка ацаніла, што ззаду ідзе фура і тармазіць трэба вельмі акуратна. У яе атрымалася ўтаймаваць машыну і плаўна спыніць яе на абочыне. Пасажыры нават не зразумелі, што адбылося. Толькі, калі ўбачылі, ва што пераўтварылася задняе кола, зніякавелі.

— Я ж папярэдзіла апаратара і пайшла мяняць кола, — успамінае той эпізод Вольга. — Уявіце сабе, з кабіны вадзіцеля выйшла дзіва ў сукенцы, мадэльных ботах — я тады наогул абутак без абцасаў не насіла, — і пайшла за дамкратам. Запаснае кола было пад днішчам машыны, мужчына з ліку пасажыраў дапамог яго дастаць. Памянялі і паспелі своечасова прыехаць у Бабруйск. Нават не спатрэбілася іншую маршрутку выклікаць.

Наступны выпадак ужо з яе практыкі работы на таксі. Аднойчы Вольга паехала выконваць заказ, які паступіў з раёна. Калі ўбачыла кампанію п'яных мужыкоў, напружылася. Разумела, што трэба нешта прыдумаць, каб абстаноўка не выйшла з-пад кантролю. Уключыла рэтра-песні і пачала пець, пасажыры падхапілі. Пелі ўсе 30 кіламетраў да Магілёва. Калі сімпатычная таксістка высаджвала кампанію, усе цёпла з ёй развіталіся і працягвалі пець.

### І крышачку — псіхолаг

Звычка не гуляць кантроль у экстрэмальнай сітуацыі — прыслухоўвацца да сябе, разважаць і не панікаваць — у яе з дзяцінства. Тады з ёй здарыўся павучальны выпадак, які ледзь не абярнуўся трагедыяй. Вольга з аднагодкай пабегла купацца на возера Вільчанка. Сама яна плаваць умела, а вось сяброўка не. Апошняя ўхапілася за бервяно, якое плавала непадалёк, і паплыла за вопытнай напарніцай. Дзяўчаты былі ўжо далёка ад берага, калі сяброўка вырашыла залезці на бервяно. Яно выслізнула, і небарака яго ўпусціла. Сама ў паніцы пайшла на дно. Вольга нырнула, выцягнула сяброўку на паверхню, тая паветра глытнула і зноў схавалася пад вадой. Дзяўчынка стала панікаваць, але Вольга яе змагла супакоіць: «Не бойся, я цябе не кіну!». Ледзь угаварыла легчы на спіну, і так-сяк даплылі да берага. Там стаялі два дарослыя мужыкі і ўсміхаліся. Калі Вольга абурылася, што яны нават не паспрабавалі дапамагчы, толькі пацiснулі плячыма: «Мы думалі, вы жартуеце».

— Тая сітуацыя была страшнай, — прызнаецца суразмоўніца. — Шмат разоў пракручвала яе ў галаве. А што было б, калі б я таксама запанікавала? Паплыла б, напрыклад, за тым бервяном? Пакуль ратавала сяброўку, сама наглыталася вады так, што ў грудзях пякло...

Вольга тонка адчувае людзей, і лічыць, што гэтаму яе навучыла прафесія:

— Кожны раз працуеш з новымі людзьмі. Пачынаеш размаўляць і разумееш, да каго які падыход павінен быць. Кагосьці трэба супакоіць, кагосьці падбадзёрыць.

Вольгу цяжка ўявіць са слязамі на вачах. Але яна прызнаецца, што бываюць хвіліны, калі яна плача. На людзях жа — выключна слёзы радасці.

— У адной вучаніцы ніяк не атрымлівалася кіраваць, і раптоўна ўсё атрымалася, — расказвае Вольга. — Яна заплакала, і я следам за ёй. Гэта былі слёзы радасці. Мая задача знайсці падыход, каб чалавек раскрыўся і навучыўся. Бываюць вучні абыякавыя, яны атрымаюць правы, але не ездзяць. А ёсць, якія цяжка вучацца, але потым ездзяць добра. Калі ёсць мэта, яе трэба дабівацца, не кідаць справу на паўдарогі. Мары павінны здзяйсняцца.

### Заставацца жанчынай

Вольга Кашанкова асоба эфектная — макіяж, адзенне, абцасы. Курсантаў, асабліва жаночага полу, гэта крыху збівае з толку. Пры словазлучэнні жанчына-інструктар уяўляеш сабе іншы вобраз.

— Калі працуеш у мужчынскім калектыве, трэба абавязкова падкрэсліваць сваю жаноцкасць, — лічыць яна. — Таму прачынацца раніцай стараюся з запасам. Не дазваляю сабе расслабляцца. З узростам раблюся больш спакайнейшай. Менш крыўдую. Разумею, што сапраўды злых людзей мала. Сама адходлівая, але прынцыповая. Калі мне здраджваюць, адпускаю, але больш з такім чалавека не збліжаюся. Бог яму суддзя. Нядаўна ў краме назірала такую карціну: стаіць жанчына сярэдняга ўзросту, побач малады чалавек з адкрытай бутэлькай гарэлкі і міліцыя. Зразумела, што скраў. Выбіраю таматы і лаўлю на сабе позірк той жанчыны, такі жаласны і просячы. Я паклала тыя таматы, падышла і спыталася, ці магу чымсьці дапамагчы. Міліцыянер сказаў: ужо не, складзены пратакол. А мне было шкада і жанчыну, і яе сына. У жыцці розныя сітуацыі бываюць. Мы павінны дапамагаць адзін аднаму, не адварочвацца, калі камусьці дрэнна, заставацца людзьмі. Бо як ты да другіх ставішся, так і Бог да цябе. Гэта ўжо правераная ісціна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Вольгі КАШАНКОВАЙ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўрапейскія палітыкі апасаюцца за сваё жыццё




Замах на экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа падчас перадвыбарчага мітынгу ўсяліў у еўрапейскіх палітыкаў страх, што яны таксама могуць падвергнуцца нападу. З такой ацэнкай выступіла еўрапейскае выданне Politico. На думку газеты, падзея, што адбылася, стала для еўрапейскіх палітыкаў напамінам аб тым, што небяспека палітычнага гвалту ў Еўропе таксама расце. На гэтым фоне лідар парламенцкай фракцыі французскай партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» Марын Ле Пэн, каментуючы замах на Трампа, папярэдзіла, што «Францыя не застрахавана ад такога гвалту». Як адзначае выданне, асцярогі еўрапейскіх эліт узмацняе і той факт, што падобнае ўжо здаралася ў Еўропе. У маі адбыўся замах на славацкага прэм'ер-міністра Роберта Фіца, у мінулым месяцы нападзенне перажыла кіраўнік дацкага ўрада Мэтэ Фрэдэриксен, а ў Вялікабрытаніі за апошнія восем гадоў забілі двух членаў парламента.

### У Вялікабрытаніі арганізацыю нелегальнай міграцыі прыраўняюць да тэрарызму

Пра гэта сказаў кароль Злучанага Каралеўства Карл III у троннай прамове з нагоды адкрыцця першай сесіі новага складу брытанскага парламента, на якой былі агучаныя галоўныя прыярытэты ўрада Лейбарысцкай партыі, паведаміла ТАСС. Карл III адзначыў, што «ўрад будзе імкнуцца ўзмацніць граніцы». Паводле яго слоў, будзе прадстаўлены дакумент аб «мадэрнізацыі іміграцыйнай сістэмы і сістэмы атрымання прытулку», а таксама аб «стварэнні новага камандавання па забеспячэнні бяспекі граніц і даванні дадатковых контртэрарыстычных паўнамоцтваў для барацьбы з арганізаванай злачыннасцю ў сферы іміграцыі». Троннае выступленне караля Злучанага Каралеўства традыцыйна рыхтуецца ўрадам. Сёлета яно складалася з больш чым 30 заканадаўчых ініцыятыў Кабінета міністраў лейбарыстаў, якія прыйшлі да ўлады ўпершыню за 14 гадоў па выніках парламенцкіх выбараў 4 ліпеня.

### На Месяцы знайшлі пячору, здольную абараніць людзей ад суровых умоў

Аб гэтым паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на часопіс Nature. Аўтарамі даследавання выступіла група вучоных з ЗША і Італіі. Аналіз даных, сабраных месяцавым разведвальным арбітальным зондам НАСА (LRO), паказаў, што Мора Спакою, якое з'яўляецца самай глыбокай на Месяцы вядомай западзінай, вядзе да пячоры шырынёй каля 45 метраў і даўжынёй каля 77 м. Пячора знаходзіцца прыкладна ў 150 метрах пад паверхняй. Паводле даных даследавання, далейшая непасрэдная разведка пячоры магла б пацвердзіць наяўнасць стабільнай падземнай абароны ад радыяцыйнага асяроддзя з аптымальнымі тэмпературнымі ўмовамі для будучага выкарыстання чалавекам. Акрамя таго, у даследаванні паведамляецца, што на розных шыротах Месяца было выяўлена больш за 200 ям.